НОВАЕ ЖЫЦЬЦЁ

Цана асобнага нумару 800 м. п.

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: Вільня, Вострабрамская вул. 9 (Ostrobramska 9).

Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 штодня апрача сьвяточных дзён.

Выходзіць раз у тыдзень.

Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 3000 м.п. Для заграніцы ўдвая даражэй.

Няпрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукованага залежыць ад рэдакцыі.

Цана абвестак: перад тэкстам 800 мк., сярод тэксту 600 мк. і на 4 стрніцы 400 мк. за радок пэтыту ў 1 шпальт.

№ 12 | Панядзелак 14-га траўня 1923 г. | Год І.

Вескавыя настроі.

Хоць і туга, марудна йдзе сёлета вясна, але ўплыў яе на палітычнае жыцьцё выяўляецца даволі ярка.

Вясна — гэта пара ўсялякіх ваенных магчымасьцей. Толькі з канцом зімы, калі сонца згоніць сьнег з зямлі і дарогі падсохнуць, робіцца магчымым рух войск. Затым то ў вясну і узьнімаюцца найбольш чуткі аб вайне.

Сёлетнія гутаркі аб магчымасьці новае калатніны ў Эўропе маюць-такі даволі добры грунт у апошніх палітычных падзеях. Ужо аружны захват французамі нямецкае тэрыторыі ў ваколіцах Рура, тэрыторыі, якая мае вялізарнае значэньне для эканамічнага адбудаваньня Нямеччыны, паказаў усяму сьвету, што Вэрсальскі трактат —ня больш, як шматок паперы. Раз тая ці другая старана не выпаўняе мірнае ўмовы, раз у ход пускаецца ізноў аружная сіла, дык значыцца, *міру няма*.

Так яно ёсьць запраўды: у Эўропе міру няма, Эўропа ізноў прыгатаўляецца да вайны. Падарожжа францускага маршала Фоша ў Польшчу — гэта першы знак, што і Францыя, і Польшча рыхтуюцца да вайны. Фош вёў з польскімі журналістамі гутарку навет аб тым, хто будзе камандаваць польскай арміяй, калі выбухне вайна.

Адначасна з падарожжай Фоша ў Польшчу — Францыя напружае ўсе свае сілы, каб наладзіць прыязныя адносіны між Польскай і яе суседкай Чэха-Славакіяй.

Адначасна румынскі кароль, галава другое суседкі Польшчы і саюзьніцы Францыі, зьбіраецца прыехаць у Польшчу, — ведама, ня дзеля прыемнасьці, а дзеля палітычных мэтаў.

Усё гэта, пагледзеўшы на карту Эўропы, ясна паказуе магчымасьць новае завірухі. Ясна, што толькі ваенная небясьпека прымушае загадзя гуртаваць сілы тых дзяржаваў, што раздзяляюць Нямеччыну і Расею, што маглі-бы сваімі аружнымі сіламі затрымаць паход расейскіх чырвоных армій на Захад у мамэнт спадзеванага выбуху вайны ў Нямеччыне, дзе народ ня ў сілах ужо цярпець зьдзек над ім з боку пераможцаў: Францыі і Бэльгіі.

Вось чаму гутаркі аб магчымасьці вайны маюць аснову ў тых палітычных кроках, якія ладзіць Францыя.

Ведама, ў мамэнт, калі-б гутаркам аб вайне суджана было апраўдацца, дзеля кожнага гаспадарства самай важнай справай будзе захаваньне ўнутранага спакою. Бязумоўна, пагроза ўнутранай завірухай у часе вайны з замежнымі ворагамі — гэта самая страшная пагроза. Як-жа стаіць гэта справа ў Польшчы?

Калі-б судзіць паводле ўнутранай палітыкі Польшчы, дык прышлося-б верыць, што якраз Польшча вайны і не спадзеваецца, і не баіцца. Польская палітыка ў адносінах да няпольскіх нацыянальнасьцей (а яны прадстаўляюць больш траціны ўсяго насяленьне Польскае Рэспублікі!) ня толькі не палепшаецца, а, наадварот, як—быццам сьвядома імкнецца да таго, каб кожны „інародзец“ не забываўся, што ён ня ў бацькаўшчыне жыве. а пад чужой, для яго ўладай. Польская палітыка ніяк ня хоча дапусьціць, каб „інародцы“ чулі сабе тут „дома“. Аб зьмене палітыкі ў болей блізкім часе і думаць ня прыходзіцца.

Значыць вайны ня будзе?

Гэтаму простаму вываду пярэчыць ізноў палітыка польскае ваеннае партыі з панам Язэпам Пілсудзкім наперадзі. Ведама, і гэтая партыя разам з сваім галавой хоча для нас ліха,—але перад заграніцай і перад сваім грамадзянствам паказуе, быццам „інародцы“, асабліва-ж беларусы, „усім чым давольны“. Ня гледзячы на тое, што ніводзін беларускі дэпутат, ніводзін запраўдны, бо выбарны, прадстаўнік беларусаў ня прымаў удзел у фошаўскіх урачыстасьцях, ваенная партыя сфабрыкавала „беларускую дэлегацыю“ з нанятых за грошы людзей, і вось мы бачылі на вуліцах Варшавы ў польскім урачыстым паходзе групку каля 60 душ: „бацьку“ Балаховіча, Дубейкоўскага, Ладнова, Грача-Ксяневіча, Адамовіча з сынам „Дзяргачом“, Міткевіча, Хведашчэню і некалькі дзесяткоў „молодцов“ балахоўскіх, што сякуць на прадаж заграніцу Белавежскую пушчу, якія ішлі пад беларускім нацыянальным бела-чырвона-белым сьцягам, нашыўшы на ім, замест пагоні, польскага арла...

Вось. гэтае жаданьне фальшаваць праўду аб польска-беларускіх адносінах — як раз благі знак, знак, што ваенная партыя рыхтуецца да вайны і дзеля гэтага туманіць вочы польскаму народу, быццам „на Шипке всё спокойно“...

Ст. Мірскі.

БЕЛАРУСКІ ПРАЦЭС У БЕЛАСТОКУ.

Год таму Польская ўлада на прасторах Горадзеншчыны арыштавала цэлыя сотні беларусаў. Адных пасадзілі ў вастрог у Беластоку, другіх у Горадні. У працягу году многіх павыпушчалі, як няслушна затрыманых. Арыштаваныя цэлы год ніяк не маглі дачакацца акту абвінавачаньня і суду. Толькі дзякуючы інтэрпаляцыі да Міністра справядлівасьці і внёску ў сойме 20 марца г. г. беларускіх паслоў, справа скранулася з месца, хоць не цалком. Беларусы, што сядзяць у Горадні, лікам нешта 50 чалавек, дагэтуль не дачакаліся ні акту абвінавачаньня, ані суду. Беларусы-ж, што сядзелі ў Беластоку, лікам 45, ужо маюць вызначаны суд на 14 мая сёл. г.

Абвінавачываюць іх у тым, што яны належылі да тайнай арганізацыі, якая мела на воку збурыць Польшчу і абвесьціць незалежную Беларусь. Арганізацыя гэта працавала на абшарах Горадзеншчыны, а падмогу мела з Літвы. У Літве арганізавалася беларуская войска, куды ўцякалі многія беларусы з граніц цяперашняй Польшчы і адтуль мелі прысьці ў Горадзеншчыну падчас паўстаньня зробленага беларускай арганізацыяй. Больш менш гэтак гаворыцца ў акце абвінавачаньня.

Апрача чыста палітычных праступкаў як відаць з таго-ж акту, нікаторых з 45 вінавацяць у звычайным бандытызьме.

Суд пачаўся 14 траўня ў Беластоку ў акружным судзе.

Мы ўжо паведамлялі (у № 7) прозьвішчы 43 падсудных, апрача яшчэ двух паслоў у сойм Барана і Яковюка. Суд клапаціўся перад Соймам аб выдачы іх, але нашы паслы самі, не чакаючы вырашэньня Сойму, дабравольна выступяць перад судом.

Польскае грамадзянства на гэту справу страшэнна абурываецца і ўсю яе прыкрывае іменем звычайнага бандытызму. Вот-жа ў гэтым трэба разабрацца. Мы разумеем, што прынамсі некаторыя беларусы з гэтага агульнага ліку дапусьціліся праступку проці Польскай дзяржаўнасьці, але мы таксама ведаем, што таргануліся яны на такую вялікую і адважную рэч, маючы на воку дабро свайго Беларускага народу і што папхнулі іх на дарогу збройнай арганізацыі ненармальныя і часта несправедлівыя да беларусаў адносіны, як Польскай Адміністрацыі, так часта і Польскай вышэйшай палітыкі.

Найсьвяцейшыя беларускія ідэалы пакрыць агідай бандытызму,—зусім не справедліва і крыўдна для ўсяго беларускага народу.

Тымбольш несправедліва і крыўдна, што даволі толькі вокам кінуць на акт абвінавачаньня, каб праканацца, як далёкі ад праўды гэны чорныя закіды проціў беларускіх паўстанцаў. Быць можа, што і запраўды нікаторым суд дакажа іхную прыналежнасьць да звычайнага бандытызму, але з гэтага ня вынлывае, што ўся справа бандыцкая. Калі хто ў якой дужа наважнай і ідэёвай арганізацыі пракрадзецца, ці што іншае нягоднае зробіць, то ціж мы тады ўсю гэнную арганізацыю назавём зладзейскай, або прыткнём якую іншую чорную ей латку? Ды дзе сям'я без вырадка? Да кожнай, хоцьбы найідэальнейшай і найсьвяцейшай справы прыклеіваюцца людзі часта найгоршыя, маючы на воку свае асабістыя нягодныя мэты.

Састаў суда гэткі: прадседацель—Дыноўскі, пракурор—Камінскі. абаронцы—па угавору: Врублеўскі (Вільня), Бабянскі (Варшава) і Міцкевіч (Вільня), на назначэньню: Грушкевіч, Целярыус, Славінскі і Рэтынгер.

Спачатку мелася на мэце прасіць у абаронцы выдатных украінскіх адвакатаў, але маючы на ўвазе непажаданыя вынікі для падсудных з прычыны падчырківаньня палітычнасьці справы, у апошнюю мінуту было пастаноўлена ўстрымацца з запросінамі.

Старадаўныя мудрацы казалі: „cara patria sed carior iustitia“ (бацькаўшчына дарагая, але справядлівасьць даражэйшая).

Ад душы жадалі-б, каб згодна з гэтымі славамі адносна да беларускіх народных змагароў, аднёсься як суд, так і ўсё польскае грамадзянства.

Палітычныя падзеі.

Кітай. Рэвалюцыя у Кітайскай рэспубліцы набірае паважнейшыя разьмеры. Першая эскадра кітайскага флоту агаласіла сябе незалежнай ад Ураду і заклікае ўсю вайсковую флоту далучыцца да рэвалюцыі.

Югаславія. Пашыч прыгатаўляе праэкт зьмены устрою Югаславіі на фэдэратыўную дзяржаву, падзеляную на тэрыторыі Сэрбіі, Чарнагорыі, Харвацыі і Славоніі.

Сцеклоў аб Лазанскай канфэрэнцыі. Недапушчэньне прадстаўнікаў С. С. С. Р. на Лазанскую канфэрэнцыю Сцеклоў тлумача баязьней Антанты саветаў. Вырашэньне пытаньняў без удзелу С. С. С. Р. будзе шкоднае для Турцыі, якая ў асобе саветаў мае адзінага бескарыснага прыяцеля, зацікаўленага ў захаваньні сапраўднай незалежнасьці Турцыі.

Закаўказкая рэспубліка. Наркоміндел Закаўказкай Фэдэрацыі афіцыяльна паведаміў прадстаўнікоў усіх дзяржаў аб заснаваньні закаўказкай рэспублікі на аснове палітычнага, вайсковага і гаспадарскага аб'еднаньня Азербейджану, Арменіі і Грузіі.

Прабег нарадаў на **Лазанскай канфэрэнцыі** характэрны галоўным чынам з таго боку, што цэнтр цяжкасьці пераносіцца на эканамічныя пытаньні і змаганьне йдзе па лініі абладаньня газавымі крыніцамі ў Масульскім райне. Амэрыка, якая да гэтага часу зусім ня ўмешывалася ў дамашнія Эўрапэйскія справы, цяпер выслала свайго прадстаўніка на канфэрэнцыю і моцна бароніць інтарэсы сваіх капіталістаў, зацікаўленных у эксплёатацыі газавых крыніц, ўжо атрымаўшых ад Турцыі вядомую канцэсыю Чэстэра. Калі прыняць пад увагу, што амэрыканскі капітал загарнуў найбагацейшыя нафтавыя канцэсыі, як на Каўказе, Сахаліне і інш., выціскаючы адтуль эўрапэйскіх капіталістаў, стане зусім зразумелы той непакой ўрадаў Антанты. а перадусім Англіі і Францыі, якія ўсімі сіламі стараюцца захаваць свае эканамічныя ўплывы на Блізкім Усходзе, рабячы націск на Турцыю і нават канцантруючы значныя вайсковыя сілы. Але эканамічная магутнасьць Амэрыкі бадаў і цяпер выйдзе пераможцам, як ужо выйшла і раней у пытаньнях аб марскіх узбраеньнях, эўрапейскіх даўгоў і інш. Зруйнаваны сусьветнай вайной капіталізм Эўропы, паволі траціць усе свае рынкі і уплывы і мы стаімо ў пярэдадні эканамічнай і палітычнай гегеміі Амэрыкі.

Францыя. Урад дамагаецца зацьверджаньня праз парлямэнт крэдытаў на кошты акупацыі Рурскага басэйну за час ад 11 студзеня да 31 траўня ў суме 231.511.874 франкаў.

Польшча. Парагаворы паміж Польшчай і Гданскам у справе урэгуляваньня шэрагу гаспадарчых спраў пярэрваны. Польскі генаральны камісар у Гданску Плюцінскі злажыў дэклярацыю, ў якой адзначыўшы, што само істнаваньне Гданска, як вольнага гораду апраўдываецца пастолькі, паскольку гэта забясьпечывае патрэбы Польшчы, пагражае зрабіць захады перад Антантай аб рэвізіі тых пунктаў Вэрсальскага трактату, якія устанаўліваюць сучаснае праўнае становішча вольнага гораду.

Нямеччына. Нямецкая прэса зьмяшчае шэраг артыкулаў, у якіх падкрэсьлівае ваеннае значэньне паездкі маршалка Фоша ў Польшчу. Прабываньне Фоша ў Кракаве, які зьяўляецца ключом да Горнага Шлёнску, і ў Пазнані—пункту найболей высунутага да Бэрліна—лічаць за падцьверджаньне гэтых дагадак. Польскія сацыялісты баяцца што прыезд Фоша ў Польшчу дорага будзе каштаваць.

Змаганьне у **Рурскім Басэйне** трывае далей. На днях узарваны жал.-дор. мост у Дюрэні і спалены склады тавараў у Кобленцы, прычыняючы шмат-мільярдныя страты. Баенны суд прыгаварыў

Коуппа і дырэктароў крупаўскіх заводаў на тэрміны ад 20 да 10 гадоў цяжкага ваетрогу, прызнаўшы іх віннымі ў загаворы процiў акупацыйнай вайсковай улады. Рабочыя крупаўскіх заводаў у знак пратэсту аб'явілі забастоўку.

Літва. 7-га траўня старшыня міністраў Гальванаўскас абвясьціў аўтаномію Клайпэды. Важнейшыя пункты аўтанамічнага статуту Клайпэды вось якія: Клайпеда атрымлівае павятовы і гмінны самаўрад. Заканадаўчым органам Клайпэды будзе сойм. Побач з соймам будзе істнаваць гаспадарчая рада, якая складаецца з прэзыдэнта краёвага дырэктарыяту, бурмістра Клайпэды, прадстаўніка профэсыянальных саюзаў і аднаго урадоўца. Краёвы дырэктарыят будзе складацца з 7 сябраў назначаных праз прэзыдэнта Літоўскай рэспублікі. Грамадзяне Клайпэды ў працагу 10 гадоў звальняюцца ад вайсковай службы. Літоўская і нямецкая мова карыстаюцца роўнымі правамі. Зьмена статуту Клайпэды можа быць зроблена толькі большасьцю 2/3 Клайпэдзкага сойму. Клайпэда выбірае да Літоўскага сойму 6 паслоў. У літоўскім урадзе засядаць будзе спэцыяльны міністар без партфэля па справам Клайпэды. У Клайпэдзе будзе прабываць літоўскі губэрнатар для абароны сувэрэнных праў Літвы.

Латвія. Шэсьць сябраў кабінэту падалося ў адстаўку. Магчыма перамена кабінэту на падставах істнаваўшай дагэтуль коаліцыі.

З газэт.

Каб не закруціла.

„Кгупіса“ у № 4, разглядаючы працу ў Сойме і партыйныя спрэчкі, у артыкуле „Соймавая крутуха“ прыходзе да пракананьня, што няма чаго спадзявацца на вялікія вынікі ад гутарак з соймавых трыбун, бо нашы паслы бязьсільны самі правясьці законы, карысныя для сялян, а паны, якіх большасьць у Сойме не памогуць, дык і выходзіць што ў Сойме, ня праца, а тузаніна, крутуха.

Калі няма чаго рабіць у Варшаве, дык многа, многа працы на вёсцы сярод сяянства! Там многа ў чым селянін наш ад сваіх паслоў патрабуе і чакае рады і навукі, каб менш было памылак, гультайства, дрэньства, маральнага гнільля, а больш здаровай беларускай адраджэнскай работы. Памятайма, што пакуль мы, інтэлігентныя беларускія працаўнікі, ня зробім з свайго народу суцэльнай, маральнай і сьведамай сілы, патуль зары праўдзівай долі і свабоды народ наш ня ўбачыць.

Трэба яшчэ адно памятаць, што калісь за гэрбы і ласкі польскіх каралёў беларуская шляхта прадала сваю душу, здрадзіла свайму народу і цяпер мы маем ня толькі пана, але і полёнізатара. Дык вось трэба памятаць і быць на старожы, каб часам варшаўскі камфорт і дыгнітарскія крэслы не завабілі цяпер да „польскосьці“ нашу інтэлегенцыю, не амяртвілі, не закруцілі яе ў панскую крутуху.

Весткі з Сойму

Камісія зямельная. Апошнім часам у гэтай Камісіі найбольш развежалі справа падаткаў на зямлю і справу пераходу вёсак на хутары. Як аб адной, так і аб другой справе яшчэ нічога не пастаноўлена, пакуль ўсё праекты.

Камісія Загранічная. У гэтай камісіі неўзабаве будзе разглядацца прапазыцыя Беларускага Клюбу аб тым, каб дапамагчы якім небудзь спосабам тым, якія жывуць над граніцай з Саветамі і праз якіх поля і лугі дужа часта прашла граніца, пакідаючы такім чынам часьць, або і палову гаспадаркі то на гэтым, то на другім баку.

Пасьля 1-га Мая.

Як можна бачыць з газэтных паведамленьняў, першамайскае сьвята ў гэтым годзе прайшло ўва ўсёй Эўропе, як і заўсёды, не саўсім ладна, не без ахвяраў і не без праліцьця рабочае крыві. Унутраная нязгоднасьць паміж сабою ў радох сацыялістаў усіх захадня-эўропэйскіх дзяржаваў пашкодзіла дружнаму агульна-масоваму выхаду на вулічныя дэманстрацыі ўсяго эўрапэйскага пралетарыяту і лікам свэім рабочыя масы Захаду былі меншымі на вуліцах, чымся ў ранейшыя гады. Але затое дэманстрацыі рабочых былі больш рэвалюцыйнымі, чымся раней.

Меншы лік дэманстрантаў лёгка тлумачыцца тым усё яшчэ ненармальным, як-бы цаўваенным тэмпам жыцьця Эўропы, ў няўхільных варунках якога пануючая буржуазная кляса можа захоўвацх сваю ўладу і *свой* цяперашні лад.

Рэвалюцыйнасьць актыўнай часьці пралетарыяту можна аб'ясьніць, як адказ на пашырэньне па Эўропе прынцыпу чыстае, адкрытае буржуазнае дыктатуры, якая ў Італіі выразілась ў форме гэтак званага „фашызму“.

Якраз там у Італіі, дзе проста з мосту рэакцыйны ўрад забараніў рабочым сьвяткаваць 1-е мая, забарона гэтая не дасягнуўшы мэты, выклікала крывавыя спатычкі дэманстрантаў з абаронным апаратам пануючых там рэакцыянэраў.

У польскай сталіцы Варшаве—таксама не абыйшлося бeз некаторых вулічных непаразуменьняў.

Як тая, так і другая старана—пануючая буржуазія і прыгнечаны пралетарыят—ў сваіх імкненьнях—з аднаго боку панаваць і далей, а з другога вызваліцца цаною ахфяраў рашучай барацьбы,—разьмежавалі востра свае пазыцыі, а умеркаванаму сацыялістычнаму лягэру прыходзіцца выбіраць адзін з двох прынцыпаў:—адкрытую дыктатуру пралетарыяту, ці чорны фашызм бяз ніякага фігавага лістка—парлямэнцкага краснабайства.

Вось за гэтымі групамі умяркаваных сацыялістаў, збанкрутаваўшых праз сацыяль—патрыятызм за час сусьветнае разаніны, ўсё яшчэ йдзе, як за старымі павадырамі, часьць эўрапэйскіх рабочых, часьць меней актыўная, менш здольная стаць на рызыкоўны шлях рэвалюцыі. Яна—гэта часьць пралетарыяту ня хочучы солідарызавацца з больш рэвалюцыйнымі таварышамі, якраз і зменшыла сабою павярхоўны выгляд першамайскіх дэманстрацыяў, але затое пазволіла ім быць саўсім выразнымі ў кірунку безкампрамісная барацьбы.

М.

К. МЕЧ.

Проба характару.

Ужо аддаўна фашызм ня ёсьць толькі нейкім мяйсцовым вырабам італьянскіх стасункаў. Фашызм—гэта голая і абсалютная буржуазная дыктатура, адкідаючая ад сябе ўселякія фразы аб правапарадку, аб дэмакратызме, аб пашанаваньні чалавека і т.п. Чым-жа, аднак, зьяўляецца дыктатура якой-небудзь клясы, калі не найвысшым пунктам клясавай барацьбы наагул, а чым-жа ёсьць клясавая барацьба, калі ня цьвёрдаю, горкаю і жорсткаю штодзённаю запраўднасьцю?

Трэба сабе выразна сказаць, што фашызм ёсьць толькі вульгарным выяўленьнем таго, што ёсьць — і што можа быць амаль у кожным бяз вынятку т. зв. цывілізаваным краі. Апрача савецкай Расеі на зямной кулі няма ніводнага кутка, дзе-б усе срэдствы зьнішчэньня—як і срэдствы прадукцыі — ня былі-б манаполем клясы ўласьнікаў, а дзеля гэтага няма краю, дзе-б перамога сіл ня была ў сучасны момант па старане буржуазіі, дзе-б гэтая буржуазія не магла акапчальна рашыць аб жыцьці і сьмерці сваіх клясавых ворагаў, дзе-б змаганьне пралетарыяту за вызваленьне не магло быць затоплена ў крыві альбо спаралізована абсалютнымі прасьледаваньнямі.

Аднак аж да апошніх часоў буржуазія ня мела патрэбы прыбегаць да гэтых крайніх срэдстваў барацьбы. Калі памінуць краі, напалову фэадальныя, дык убачым, што аж да часу вайны дыктатура буржуазіі магла прыкрывацца прыгожым і імпануючым канстытуцыйна-дэмакратычным апаратам з усімі ягонымі пекнымі ўласнасьцямі, як цярпімасьць, як цэлы шэраг уселякіх свабодаў(свабода перакананьняў, рэлігіі, працы, арганізацыі, забастовак і г.д і г.д.), як пашанаваньне правоў і інш. Што буржуазія магла сабе пазволіць на гэты збытак, гэта было вынікам цэлага шэрагу вядомых гістарычных прычын. Мела ўплыў тут і так званая публічная апінія, выхаваная ў значнай меры на ўспамінах супольных рэвалюцыйных змаганьняў буржуазіі і работнікаў з фэодалізмам і умысловы стан рабочай люднасьці, якая хоць і здавала сабе справу з вызыску і імкнулася да сацыялізму, але на практыцы ўважала гэты сацыялізм за штось-ці на кшталт царства божага на зямлі, а капіталізм—за неперамoжную сілу, з якой, відавочна, трэба змагацца, але змагацца перадусім аб злабаднеўных патрэбах, каб выгадней устроіцца ў ценю яго панаваньня. Усе гэтыя і іншыя гістарычныя прычыны можна вытлумачыць адным аснаўным гаспадарчым зьявішчам: краі,

ДЗЯЎЧЫНА.

ЛЯГЕНДА.

1

Там, на Беларусі, дзе пачаў жыцьцё,—
чуў я,—колькі чуў я! — як шуміць трысьцё.
Бы цымбалаў струны, шчыльныя рады
Шапацелі звонам ля ракі тагды...
Казкі чуў, калісьці, ў шэптах тых радоў,
песьні чуў у звонё... Ой, даўно, даўно...
Казак тых забыўся—лёс выгнанца з'еў...
Песьні разьліліся, што туман між дрэў...
Што-ж палаеш сэрца? Што крынічыш кроў?
Чараўнічых песьняў не вярнуць ізноў...
Казкі ці лягенды? Хоць-бы аднае?—
Хай трысьцё успомняць думачкі мае...

2.

Астатнімі сталі ля ставу сьнягі,
пазьніклі зімовыя золкія веі.
З вясноваю вопраткай сьвет стаў другі,
па новаму вецер павеяў...
Здалёку—Усходняй адзін стараны,
здалёку—другі аж Заходняга боку,—
прыйшлі ў Беларусь маладыя яны:
Дзяўчына вядома навокал.
Красуня Дзяўчына! У вочах блакіт,
а твар бель—ірдзельнай вазёрнай лялеі...
Красуня Дзяўчына! Вянок—васількі;
з іх водарыць дзіўным алеем...
Зірнець—нібы косы ад сонца плывуць,
зірнець—нібы зоркі над сьветам праменяць.
Ачмуціць той погляд, той зірк галаву.
Каханьне—захопіць у жменю...
Рабілі залёты свае дзяцюкі
ў Зялёная Сьвята, Купальле, Каляды.
Адказ атрымалі: „Надзею ты кінь,
няхай расквітаець на лядах“...
З далёку—Усходняй адзін стараны,
здалёку—другі аж Заходняга боку,—
прыйшлі ў Беларусь маладыя яны;
Дзяўчына—іх мэтаў сутока.

3.

„Гудзяць лясы, гудзяць лясы над гарою,
прападаю маладая ў непакою, ў непакою.
Шуміць вада, шуміць вада пад лядамі,
што-ж мне жыці занядбанай, занядбанай?
Цісніць камінь, цісьніць камінь, каб ня чулі,
цяжка зрэбная кашуля, ой кашуля!
Птушкі лятуць, птушкі лятуць ды у вырай,
я ў далёкі край багаты рыну, рыну...
Лятуць лісты, лятуць лісты па лагчыне,
сваю долю пашукаю на чыжыне, на чужыне.
Шуміць вада, шуміць вада пад лядамі.
што-ж мне жыці занядбанай, занядбанай?“

4.

Шэрыя хаты апрыкралі,
апрыкралі песьні маркотныя.
Цягніць Дзяўчыну на прыхамаць,
каб сьцежку знайсьці зваротную.—
Дзяцюкам чужаземным гаворыць так:
„Той выбраным будзець маім,
хто прабегчы першы здолеіць
ад хвой у бары—да гары“...
Шэрыя хаты апрыкралі,
апрыкралі песьні маркотныя.
Цягніць Дзяўчыну на прыхамаць,
каб сьцежку знайсьці зваротную...

5.

Дзеўка стала на каменьнях
над чаўном лагчын.
Сьціхла вёска. Ў задуменьні
нізкі стрэх—аўчын.
Толькі сонца з высь—блакіту
разьлівае ў сьвет,
як у казцы „акавіту“—
праменісты сьлед.

Плечы ў плечы, ветрамётна
дзяцюкі лятуць.
Скачыць сэрца прадсьмяротна,
у ваччу іх муць.
Вось і мэта... чараўніца..
Толькі пядзя... чверць..
Не з пад хмары бліскавіца:
то зірнула сьмерць...
Хлопцы Дзеўцы той дзівоснай
у апошні раз
паглядзелі ў вочы млосна—
з тым іх дух і згас...

6.

Спатыкнуўшыся ў камінь загубілі жыцьцё
дзяцюкі і Дзяўчыны тагды.
Як туман апусьцілася ў сэрца чуцьцё
гэтай чорнай, страшэннай бяды.
Зграмадзіліся людзі, прыйшлі да гары,
пахавалі на ёй маладых
і, як кажыць лягенда ад даўняй пары,
палажылі й Дзяўчыну туды.
З тых часін над гарой паўзрасьлі два дубы,
з імі поплеч—бяроза стаіць.
Дзяцюкі гэта ў неба паўзьнялі чубы,
а бяроза—дзяўчына між іх..

7.

Даўно адцьвілі там дзеі,
дубы ўсё шумяць з бярозай
і толькі вятры-зладзеі
плятуць дакор нецьвяроза.—
„Жыцьця—дай адну ты мэту,
адну—бо і сам адзіны;
аповесьць вячыстую гэту
табе растлумачаць часіны“...
І толькі яны, сукамі,
злучаюць тых дрэў верхавіны.
А людзі—іх языкамі—
празвалі гару Дзяўчынай.

8.

Там, на Беларусі, дзе пачаў жыцьцё,
чуў я, колькі чуў я!—як шуміць трысьцё.
Бы цымбалаў струны, шчыльныя рады
шапацелі з звонам ля ракі тагды...
Казкі чуў, калісьці, ў шэптах тых радоў,
песьні чуў у звоне... Ой, даўно, даўно!
Казак тых забыўся—лёс выгнанца з'еў...
Песьні разьліліся, што туман між дрэў...
Што-ж палаеш сэрца? Што крынічыш кроў?
Песьні чараўніцы прылятуць ізноў!
Казкі ці лягенды, шмат, не аднае! —
Зноў пачуеш, пэўна!—ў Роднае маей...
Зноў на Беларусь я, дзе пачаў жыцьцё,
слухаць іх вярнуся... Зашумі, трысьцё!..

У. Дубоўка.

Да нашых чытачоу і падпісчыкау.

„Новае Жыцьцё“ адзіная ў Заходняй Беларусі беларуская газэта, якая стаіць у абароне інтарэсаў працоўнага сялянства і рабочых.

Кожны сьвядомы беларус павінен чытаць, распаўсюджываць, выпісываць і дапамагаць сваей газэце.

Сучасная ўсё ўзрастаючая дарагавізна стварае цяжкія варункі для выданьня газэты. Ад грашовага падтрыманьня праз беларускае грамадзянства залежыць рэгулярны выхад нашай часопісі.

Рэгулярна ўнасіце падпіску і даплату.

Амэрыканскія беларусы неадкладна і рашуча павінны падтрымаць „Новае Жыцьцё“, каб не ўпаў беларускі сьцяг на беспатольнай Бацькаўшчыне.

Рэдакцыя і адміністрацыя.

якія капіталістычна былі найбольш разьвіты, састаўлялі ў суме досыць малы кусок на кулі зямной, але дзякуючы вышэй тэхніцы і імпэрыялістычнай экспансіі маглі вызысківаць люднасьць, амаль усяго сьвету. Дзеля гэтага цяжар накопліваньня новых капіталаў можна было, хаця-б часткова, пералажыць з плячэй уласных работнікаў на люднасьць краёў, падданых імпэрыялістычнаму вызыску, і наагул выгадней было як-небудзь паразумецца з гэтымі работнікамі, хоць-бы цаною дробных уступак, каб толькі працэс вырабчасьці ня быў парушаны паважнейшымі завірухамі, каб толькі і надалей можна было спакойна вясьці імпэрыялістычную палітыку. Вось дзе тайна адноснай міралюбівасьці эўрапэйскага капіталу ў сябе дома ў другой палове XIX веку. Уся Заходняя Эўропа заняла адносна рэшты сьвету становішча, падобна, як старажытны Рым—да міжзэмнаморскіх краёў. Заходня-эўрапэйскія работнікі, а прынамсі некаторыя іх слаі, сталі мець сякую-такую карысьць з гэтага палажэньня рэчаў, і хоць частка агульнага даходу, якая прыпадала ім, усьцяж зьменшывалася, аднакжа-ж іх спажыўчасьць, бяручы безадносна, павялічывалася, падвышаўся уравень іх прафэсыянальнага вышкаленьня, а разам з тым і іх арганізацыя і пачуцьцё сваей высшасьці і некаторая паблажлівасьць на цёмныя староны істнуючага парадку. Вось-жа на гэткім гістарычным грунце і вырасла лягэнда аб якойсь-ці, быццам, асобнай „заходня-эўрапэйскай“ культуры, аб яе цярпімасьці, аб разыгрываньні ўселякіх сацыяльных змаганьняў саленым способам, у глянсаваных рукавічках, праз парлямэнцкія галасаваньні, аб паступовым урастаньні сацыялізму ў капіталізм і г. д.

Але „на тым сьвеце сьмерць ўсё зьнішча: у красцы нават чарвяк жыруе“. Імпэрыялізм мог мець найлепшыя дастоінствы, але меў напэўна адну дробную ваду: быў наладаваны серкай і салетрай і *павінен быў* давясьці да катастрофы. Ідучы ад аднаго крызысу да другога, ўрэшці давёў да крызысу аб нябывалай руйнуючай сіле: да вайны. На паваенным магільніку мусіла абарвацца буржуазна-работніцкая ідылія. Калі работнікі заўсёды павінны былі аплачываць кошты нават кожнага нармальнага гаспадарчага крызысу, дык што-ж казаць аб тым вялізарным патрасеньні, калі рэч ідзе ўжо проста *аб адбудове капіталізму*, калі сусьветны рынак альбо перастаў істнаваць, альбо шмат зузіўся, калі даўныя крэпасьці капіталізму ў Эўропе ня толькі, бадай зусім, утрацілі магчымасьць эканамічнага пакарэньня і вызыску сьвету, але нават самі паступова становяцца каленіямі „янкі“! Капіталізм быццам варочаецца да пэрыаду, вядомага ў марксыстскай эканоміі пад назовай „першага пачатковага накопліваньня“, а разам з тым пачынае праяўляць сваю даўнейшую дзікасьць і безадноснасьць. Чым болей крызыс перарастае сілы буржуазіі, чым болей зьнішчана накопленая мёртвая праца, тым большыя і цьвярдзейшыя мусяць быць вымаганьні, якія ставяцца жывой сіле пралетарыята.

Дзеля гэтага фашызм ёсьць абавязковай формай перыаду заняпаду капіталізму, падобна як імпэрыялізм быў формай яго найбольшай магутнасьці. Калі ў той час буржуазія магла велікадушна цярпець нават імкненьня да замены істнуючага устрою і праклямаваць прынцып раўнапраўя ўсіх пагляда́ў, то гэта было дзеля таго, што мела тысячы іншых срэдстваў і способаў, каб утрымаць масы ў паслушэнстве. Цяпер нэндза, дарагавізна і безрабоцьце пераконываюць усіх, што капіталістычны лад няздольны нават адвярнуць звычайныя няудачы, цяпер ніхто ня верыць у яго несьмяротнасьць, цяпер сацыялізм перастаў быць нейкай марай небеснай, нейкім шалёным скокам у пустату, ў цемру, ў невядомасьць. Пастаўлены паміж патрэбнасьцю выцісьнуць як найбольшую колькасьць прыбагачнай вартасьці і страхам хуткага перавароту капітал ня можа ўжо дбаць аб паказной праўнасьці, ня можа стасаваць даўнэйшага цяжкага правадаўчага апарату, але робіць высілкі абезуладніць праціўніка па магчымасьці зьнічэўку і аканчальна.

Дык вось якія гістарычныя і эканамічныя крыніцы фашызму. Ен створаны тым самым сьмяротным крызысам капіталізму, які мы тут у Польшчы завём дарагавізнай. У Італіі гэтая балотная кветка расьцьвіла найпышней, але і ў шэрагу іншых краёў буржуазія тым ахватней робіць высілкі ўзыйсьці на гэтую сьцежку, чым болей крызыс перарастае яе сілы, чым больш яе страх, тым большая безраднасьць. Відавочна, гэта ня значыць, што фашызм ёсьць якімсь-ці цудоўным выхадам з закаулка, ў які забрыў капіталістычны лад. Нават у выпадку аканчальнай перамогі над работнікамі ў міжнародным маштабе, фашызм быў-бы толькі вырадзіўшымся капіталізмам, бо азначаў—бы пэрыяд старчага бязьсільля пры захаваньні і ўсіленьні ўзрываючых гэты капіталізм з-замаладу супярэчнасьцей і небясьпек. Дыктатура фашызму азначала-б шалёнае зьмяншэньне прадуктыўнасьці працы, а значыцца заняпад культуры; адначасна абастрылася-б міжнародная канкурэнцыя і заборчыя тэндэнцыі, якія-б прывялі да новых войнаў і яшчэ большых крызысаў.

У каждым выпадку фашызм ужо і цяпер мае адзін неунікнёны вынік—гэта *ускарэньне і ажыўленьне* тэмпу клясавай барацьбы. Можа гэта пакажацца дзіўным, калі прыняць пад увагу тэй пазорны трупехлы безрух, які запанаваў ува ўсіх краёх, якія ў тэй ці іншай меры упраўляюцца мэтадамі фашызму. Аднакжа гэта бязсумліўная праўда. Сталыпінаўская рэакцыя ў Расеі таксама пазорна абезуладніла рэвалюцыйны рух, аднак-жа безпасрэдна пасьля гэтага наступіў запраўдны ўзрыў вулькану. Фашызм пераменіў і яшчэ можа пераменіць шэраг краёў у нейкія мёртвыя вазёры альбо могільнікі, але каб буржуазія паслугоўвалася нават у сто разоў мацнейшымі мэханічнымі срэдствамі прымусу і пастраху, дык усёж-такі сацыяльнае разьвіцьцё ёсьць зьявішчам занадта зложаным, каб на заўсёды можна было зьмяніць яго цячэньне аднымі толькі срэдствамі мэханічнага прымусу. Стаптаныя праз фашызм бажкі „правапарадку“, „дэмакратызму“, „парлямэнтарызму“ і г. д. прыдуманы былі, хіба-ж, не для утрудненьня, але для аблегчэньня панаваньня ўладаючых клясаў, а развіцьцё клясавых змаганьняў — хоць-бы ў апошнія гады — дастарчае тысячы довадаў, якія неацанімыя услугі аддаў урадам іменна *стан -умыслаў* работніцкіх. Восьжа калі цяпер буржуазія сама выракаецца тых карысьцей, дык змушана рабіць гэта горкаю неабходнасьцю, якая выбівае з яе рук адну за другою ўсе прылады панаваньня.

Дыктатура фашызму павінна прысьпяшыць ход клясавай барацьбы, бо дашчэнту разьбівае аблуду рэфармізму і утопію клясавай угодлівасьці ні дабравольнага прыслугоўваньня. Наперакор ідылічным тэорыям апосталоў угодлівасьці, якія гласяць, што сацыяльнае разьвіцьцё незаметна, лагодна і сонечна ўвядзе так неяк ні з таго ні з сяго працоўныя клясы ў рай сацыялізму, вайна і фашызм даказалі, што вызваленьне ёсьць заўсёды перамогаю, што павінна здабывацца крывавай працай і мукай, што як калісь, так і цяпер вымагае найвысшай меры геройства, асабістай адвагі, пагарды для сьмерці—словам ня толькі розуму але і характару.

У змаганьні на розум пралетарыят даўно ўжо аказаўся праціўнікам ня толькі ня ўступаючым буржуазіі, але можа нават правышаючы яе. Пры выхадзе сваім на сусьветную гістарычную арэну патрафіў ён выдаць альбо прыцягнуць да сябе найбольшыя умы, а тэарытычны аналіз выпадкаў, зроблены тады праз геніальных правадыроў работніцкай клясы спраўджаецца з нячуванай дакладнасьцю. Але цяпер справа йдзе ўжо не аб адным тольні розуме. Работнікі могуць быць тысячу раз правы, даказываючы, што буржуазная палітыка вядзе да згубы і руйнаваньня. Іхныя аргумэнты спатыкаюцца з глухою і сьляпою перамогаю. Капітал праіграўшы барацьбу на розумы, распачынае барацьбу на сэрцах. Ня здолаўшы пераканаць, хоча запужаць. Ці-ж работніцкі рух ня вытрымае гэтай пробы характару? Што выдаўшы геніяльных тэорэтыкаў ня знойдзе так-сама геніяльных людзей чыну, якія патрафяць нанесьці патрэбны удар у адпаведную хвілю? Італьянскія выпадкі даказалі, што для работнікаў няма больш згубных рэчаў, чым рэвалюцыйная фразэолёгія, за якой не стаіць гатоўнасьць да рашучага чыну. Італьянскія досьледы зьяўляюцца магутнай пакусай для ўсіх сусьветных рэакцыяністаў, але так-сама і навукай для работніцкай клясы. Навукай, якая ў лес ня пойдзе.

Неадкладная справа.

Сярод нашых пісьменьнікаў, якія знаходзяцца ў Заходняй Беларусі, часта-густа паўстае думка стварыць тут тоўсты бекарускі журнал-месячнік ці квартальнік. Ідэю гэтую падтрымліваюць і шырокія кругі прыхільнікаў беларускага друку.

Калі аналёгічныя думкі родзяцца ў некалькі асоб адначасна, значыць час дасьпеў, думку трэба рэалізаваць. Трэба зазначыць, што ў нас для выданьня беларускага месячніка ёсьць грунт, ёсьць магчымасьць і спачуваньне да гэтай справы.

Тут трэба мець на ўвазе цярплівасьць, ахвярнасьць, зацікаўленасьць чытачоў-беларусаў. Не зважаючы на тое, што беларускія газэты чуць не сыстэматычна закрываюцца пасьля дзесятка намяроў, праз колькі намяроў канфіскуюцца, нішчацца на поштах, гмінах, — усёткі як падпісчыкаў павялічываецца, патрэба беларускага друкованага слова ўзрастае. У рэдакцыю нашай газэты прыходзіць шмат пісем з запытаньнямі ці ня выходзяць якія іншыя беларускія часопісі, ці няма якіх навінак літэратурных.

З другога боку мы чуем, што ў нашых пісьменьнікаў ляжыць пад спудам шмат рукапісаў, чуем нараканьне, што няма дзе друкавацца, няма крытыкі, няма кузьні дзе-б каваласяграмадзкая думка, набіралася пругкасьці арыентацыя ў сучасным літэратурна-навуковым і грамадзка-палітычным жыцьці.

Адгэтуль вывад, што нам неабходна, неадкладна трэба прыступіць да выданьня адпаведнай часопісі прыблізна з такімі аддзеламі:

Красная пісьменства. У гэтым аддзеле зьмешчаліся-б выдатнейшыя творы беларускіх паэтаў, белетрыстаў і пераклады на беларускую мову з шэдэўраў сусьветнай літэратуры. Пры гэтым трэба зьвярнуць увагу на тое, каб як можна больш адкрыць дарогу для маладых пачынаючых мастакоў, якія выходзяць з беларускай працоўнай гушчы.

Навуковы. У навуковай, але даступнай форме даць шырокаму чытачу асьвятленьне усіх найбольш важных праблем сучаснага навуковага жыцьця.

Грамадзка—палітычны. Увясьці чытача ў курс галоўных пытаньняў і задач палітыкі, эканомікі, дзяржаўнага і культурнага будаўніцтва Беларусі і гаспадарствоў другіх народаў.

Літэратурна—крытычны. Павінен мець сваім заданьнем перагляд старых крытэрыяў і мэтадаў з пралетарскага пункту гледжаньня, каб захаваць беларускую літэратуру ад буржуазнага зьместу і аджыўшых формаў. Навукова-крытычны агляд напрамкаў і школ у мастацтве. Мабілізацыя грамадзкай увагі да хараства выдатнейшых твораў сучаснасьці, незалежна ад літэратурных напрамкаў.

Бібліяграфічны. Пастаянна даваць сыстэматычны агляд найбольш важных і цікавых зьявішч літэратуры ў галінах навукі, мастацтва, палітыкі, эканомікі.

Хроніка і інфармацыя. Даваць найнавейшыя інфармацыі, - агляд міжнароднага і ўнутранага жыцьця, хроніку літэратурнага і навуковага жыцьця,—падтрымліваць самую цесную сувязь з чытачамі.

Журнал павінен быць беспартыйны, павінен адкрыць свае старонкі для ўсіх, хто захоча палажыць цэгліну ў культурнае і дзяржаўнае будаўніцтва Беларусі.

Журнал павінен аб'еднаць усіх пісьменьнікаў, супрацоўнікаў і чытачоў і гэтым колектывам будавацца і разьвівацца і дбаць аб тое, каб ён стаў трыбунай для выдатнейшых мастацкіх твораў і нашай публіцыстыкі, у ім павінна выявіцца шуканьне новага зьместу, новых форм, ён павінен абагаціць беларускі слоўнік. Патрэбна сур'ёзная папулярызацыя навукі на беларускай мове—правясьці ў жыцьцё, каб такім чынам паслужыць прычынай яе разьвіцця.

Журнал павінен задаволіць літэратурныя патрэбы шырокіх кругоў беларускіх чытачоў, выкрысталізовываць іх соцыяльныя і нацыянальныя імкненьні.

Усходныя Беларусь-шчасьлівейшая, там ўжо бадай ад году як выходзіць часопісь „Полымя“, месячнік літэратуры, палітыкі, культуры, эканомікі і публіцыстыкі. Журнал, ня гледзючы на строга камуністычны адпечатак усё-ткі захаваў сваю беларускую самабытнасьць і выяўляе радасную сялянскую бадзёрнасьць духа. Кожны аддзел апрацаваны старанна і багата па зьместу. Вялікая заслуга месячніка ў тым, што бадай няма ў ім радка, якога-б не зразумеў беларускі рабочы, селянін і вучашчая моладзь.

У нас у Вільні ад нейкага часу беларуская акадэміцкая моладзь з энтузіязмам рыхтуецца да выданьня тоўстага месячніка. Хай спарыцца і красуе іхняя праца, хай паслужа добрым пачаткам для зьдзяйсьненьня выказанай вышэй думкі.

Р. Юргілевіч.

ДОРОШЭНКО

Барацьба Ірляндыі за сваю волю.

(гл. № 11 „Н. Ж.“).

Канец 19 веку ў жыцьці Ірляндыі адзначыўся адраджэньнем нацыянальнае сьвядомасьці, ў развіцьцю якое вялікую ролю адыграла „Ірляндзкая супалка“, якая заснавалася ў 1891 г. Спачатку праграма яе мела культурна-прасьветны характар, але гэтым, пры тагдашніх умовах ірляндскага жыцьця абмежавацца ня можна было. У 1899 г. утварылася „Аб'еднаная Ірляндзкая супалка“, якая аб'еднала ўсіх ірляндцаў, як тых, што жылі у сябе на бацькаўшчыне, так і тых што жылі ў Англіі і Амэрыцы. Новая арганізацыя была спадкаемніцай ідэй ранейшых „Каталіцкай“ і „Зямельнай“ супалак, але аб'яднаўшы ўвесь народ пад нацыянальным штандарам паставіла барацьбу за зямлю і волю на моцны грунт.

Новае пакаленьне Ірляндцаў, якое выхоўвалася ў родных школах роднай літэратуры і гісторыі, дало тых нязморных байцоў, якія без ваганьня аддавалі ў астатняй вайне свае маладое жыцьце за родны край. У астатку вечны неспакой ў Ірляндыі стаў для Англіі не на руку і вот Льойд Джорж запрапанаваў ірляндскім рэвалюцыянерам мір. Умовы гэтага міру былі такія:

Ірляндыя пад імям Вольнай Ірляндзкай Дзяржавы атрымывае канстытуцыю падобную да той, якую маюць дамініі, іначай заморскія каленіі Англіі з уласным соймам і адказнаю перад ім экзэкутываю.

Аружныя сілы Вялікае Брытаніі наразі бяруць на сябе ахарону Ірляндзкіх берагоў. Ірляндыя атрымывае сваю ўласную армію прапарцыянальную да адносін ліку яе люднасьці, да ліку жыхароў Брытаніі. Ульстэру даецца права уласьці ў склад Вольнае Ірляндыі, альбо астацца—за яе межамі. Дзеля ухваленьня гэтага склікаецца агульна-імперскі (ангельскі) парлямэнт і парлямэнт „Палудневай Ірляндыі“. Гэты астатні меў на мэці ўтварыць тымчасовы ўрад, які павінен быў апрацаваць статут парлямэнту і ураду Вольнае Ірляндзкае Дзяржавы.

Па умові прадугледжывалась істнаваньне Супольнае Рады, у якую ўваходзілі-б прадстаўнікі Ірляндыі палудневай і паўночнай (Ульстэру). Пагляды ірляндзкіх дзеячоў адносна да прыняцьця гэтых умоваў падзяліліся. Адна частка да якое належалі Гріффітс і Колінз настаівалі на прыняцьці умоў, узмацняючы свой пагляд тым, што 1) умовы міру запрапанавалі Англія пад пагрозаю крывавае і рашучае вайны на выпадак іх ня прыняцьця 2) народ ірляндзкі завельмі стружданы няупыннаю нароўнаю барацьбою, якая трывае ўжо восьпяць год, 3) Ірляндыя нарэшці атрымлівае вайсковую, грашовую і юрыдычную аўтаномію і павінна наразі ўзяць тоя, што даюць, каб потым здабыць усе.

Де Валера ўважаў немагчымым прыняцьця умоваў. Найнебяспачнейшай точкай, на яго думку, было абмежаваньня асобнасьці Ульстэру, бо праз гэта утвараліся дзьве штучныя дзяржавы, з якіх тарганіла-б дзеяльнасьць другой у прадугледжанай Супольнай Радзе і абедзьве былі-б падлеглымі ангельскаму Ураду.

Акрамя таго блізкасьць Англіі заўсёды была-б пагрозаю дзеля Ірляндскае аўтаноміі. І калі пры такой самай кансьцітуцыі Аўстралія, Новая Зэляндыя і іншыя далекія каленіі былі зусім незалежна, існаваньне Ірляндзкае Дзяржавы было-б пад пільным і ня ўпынным дагледам Англіі, якая ў кожную хвіліну магла-б навесьці туды свае войска. Дзеля таго па думцы Де Валеры Ірляндыя павінна быць цалком незалежнаю. Ні на якую умову ён ня згодзіцца і калі ня можна асіліць, то астаецца толькі ўмярці з аружжам у руках.

І Де-Валера з сваімі прыхільнікамі далей вёў барацьбу, якая прыняла партызанскі характар, а Гріффітс 6 студня 1921 году паппісаў міравыя умовы з Англіяй.

У цяжкіх варунках разладу прыйшлося яму весьці працу над збудаваньнем новага дзяржаўнага жыцьця. Многа стараньня палажыў ён, каб навярнуць Де-Валеру да згоды і спыніць братабойчую барацьбу. Падкошаны даўнейшаю хваробаю ён раптоўна памёр. Яго мейсца заступіў прэзыдэнт Міністраў Коллінз. Адвача і гэты ня доўга трымаў уладу ў сваіх руках: у жніўні ён быў забіты паўстанцамі Дэ-Валеры.

Такім чынам до апошняга мамэнту ў Ірляндыі ня ўціхае барацьба. Ці пойдзе Англія на далейшыя уступкі, пакажа будучына. Аднак можна сказаць: ірляндзкі народ, які выявіў такую здолнасьць да організованай барацьбы ў рожных яе вираявах, такую загартованнасьць і вытрываласьць, які даў столькі гэрояў—гэты народ здабудзе сабе жаданую волю.

(Канец).

З усяе Беларусі.

Пружанскі павет.

Сяляне вёскі Жадзены, Дабучынскай гм. саставілі прыгавор адчыніць беларускую школу. Дзяцей школьнага ўзросту набралася да 100 асоб.

Калі прыгавар быў пададзены войту Рагожынскаму, каб ён зацьвердзіў падпісы, дык войт ня толькі не зацьвердзіў, але затрымаў у сябе прыгавар і стаў пагражаць паліцыяй і арыштамі убачыўшы ў прыгавары неякі бунт. Наагуль гэты пан вуйт зьдзекуецца над беларусамі, як умее і як хоча, а скінуць яго сяляне ня могуць і баяцца, бо ён „цар і Бог“, бо ён слуга пакорны вельміможнага пана старосты.

Селянін.

м. Радашкавічы. Вялейскага пав.

У нашага сьвяшчэньніка К. Жалязоўскага польская улада забрала царкоўную зямлю. Праўда, сьвяшчэньнік сам не абрабляў яе, але-ж тады чаму-ж не забіраюць зямлі і ад нашых тутэйшых паноў; яны-ж таксама ні аруць свaей зямлі, ня возяць гною, ня косяць. І яшчэ ня так было-б крыўдна, каб гэную царкоўную зямлю ды аддалі чалавеку безьзямельнаму, які сам працаваў-бы на ёй, а то аддалі польскаму вучыцелю і пісару, а гыя здалі зямлю гэтую ў арэнду і вышла так: толькі вучыцель ды і пісар набіраюць вялікую пэнсію ды і зямлю цяпер дасталі, а сьвяшчэньнік пэнсіі жаднай не мае, палавіна парафіі за-граніцай, даходу стала куды менш, а цяпер і зямлю адабралі для польскіх урадоўцаў. Дрэнныя у нас справы.

Бацадысь.

Хата Беларускай культуры і мастацтва у Бабруйску

Адбыўса агульны сход сяброў хаткі. Быў абгавораны далейшы плян працы, перагледжан статут хаткі, у аснову якога зараз паложаны пастановы апошняй партыйнай канфэрэнцыі. Пастаноўлена шырэй ахапіць працу на павеце, разам з тым выхаваць сваіх сяброў у марксісцкім напрамку і справідлова растлумачыць кожнаму з іх нацыянальнае пытаньне.

Пры хатцы ідзе навучаньне сяброў—апрача гісторіі, мовы і беларускае літэратуры—палітычнай эканоміі, гістарычнаму матэрыялізму, разгляду марксісцкае літэратуры па нацыянальнаму пытаньню. Зьвернута ўвага на дысцыпліну сяброў хаткі. Прыкметнае ажыўленьне працы і здаровы грунт, на які гэта праца стала, дае надзеі, што хатка зробіць карысьць дзеля разьвіцьця беларускае культуры і вызваленьне з цемры працоўных мас.

Цяпер хатка рыхтуецца к выданьню 2-га нумару эваёй часопісі „Прамянчык“.

Алесь НОВЫ.

Гомельшчына.

Прамысловасьць Гомельскай губэрні.

Агульны лік працуючых на ўсіх прадпрыемствах: рабочых—9398 і служачых—1106.

Інтэнсыўнасьць працы рабочых у параўнаньні з ранейшымі гадамі рэвалюцыі цавялічылася ў 1923 годзе ў два разы.

За апошнія 5 месяцаў выпаўнена запалтрэстам—66 проц., тэкстыльным трэстам—120 проц. сырца і 93 проп. гатовага сукна, папяровым трэстам—87 проц.

Процант нагрузкі прадпрыёмстваў у параўнаньні з 1913 г. такі: запалачная прамысловасьць—129 проц., тэкстыльная—59 проц., папяровая—60 проц., сьпіртовая—62 проценты.

З сакавіка 22 году да студзеня 23 году прамысловасьць Гомельшчыны заплаціла ўсе падаткі—558.000 таварных руб.

Смаленшчына.

Падняцьце тарфяной справы.

Узбуджана хадайніцтва перад цэнтрам аб падняцьці тарфяной справы ў Смаленшчыне дзеля чаго прызнапа патрэбным перадаць тарфяную справу пад кіраўніцтва губ. органаў.

Наладжаньне малочнай гаспадаркі.

Дзеля разьвіцьця малочнай гаспадаркі ў Смаленшчыне прызнана патрэбным стварыць спэцыяльны фонд.

Жыцьце Ігуменшчыны.

Грунтам эканамічнага жыцьця Ігуменшчыны зьявляецц сельская гаспадарка. Павятовы Выканаўчы Камітэт шмат увагі аддае савецкім гаспадаркам павету. Становішча большай часьцю іх здавальняюча. Сялянская гаспадарка ў павеце таксама даволі моцная. Адчуваецца недахват сельск.-гасп. прыладаў. Дзеля гэтага зьвернута належная ўвага на наладжаньне сельска-гаспадарчых майстроўняў. У Навасёках наладжана майстроўня па папраўцы сельска-гаспадарчых прыладаў.

У дарожнай справе таксама зроблены значныя посьпехі. Будуюцца і папраўляюцца масты. На тракце Ігумен—Пухавічы ўсе масты ўжо адбудованы нанова.

Школьная справа ў зьвязку з увядзеньнем колектыўных умоваў значна палепшылася.

Становішча мэдэцынскіх працаўнікоў таксама паляпшаецца. У Ігумене скончана пабудоўка дзіцячай больніцы.

Праца валасных выканаўчых камітэтаў і сельсаветаў праходзіць нармальна. Усе падаткі выпаўнены поўнасьцю.

З беларускага жыцьця.

Белар. Цэнтр. Шк. Рады.

На паседжаньні прэзыдыуму Цэнтр. Бел. Шк. Рады 12. V. 23 г. прынята пастанова каб на 6 чэрвеня склікаць па 1 прадстаўніку ад беларускіх гімназіі для утварэньня пры Цэнтр. Шк. Радзе сэкцыі сярэдн. бел. школ, згодна пастанове зьезду 11—14 красавіка.

У зьвязку з дрэнным фінансавым становішчам беларускіх гімназіі паўстаець думка ў Ц. Б. Шк. Радзе аб пераконструіраваньні першых трох клясаў некаторых гімназій ў семіклясовыя пачатковыя беларускія школы з утрыманьнем на кошт ураду.

→ **Новая часопісь.** Т. Куніцкі злажыў дэклярацыю Камісару Урада гор. Вільні для выданьня і рэдагаваньня часопісі „Моладзь Беларусі“ літэратурны, культурна-навуковы і грамадзкі месячнік.

→ Вышаў № 4 „Кгупісу“ беларуская тыднёвая часопісь, якая друкуюцца лапінікай.

→ **У суд за брахню.** Пасол Тарашкевіч падаў Віленскаму пракурору заяву, каб пацягнуць да адказнасьці рэдактара польскай газэты „Dziennik Wileński“ за фальшывыя інфармацыі аб дзейнасьці беларускіх пасloў і за падбурэньне палякаў на беларусаў.

Гэтага-ж рэдактара цягнуць у суд за ганебны паклёп старшыня Беларус. Грамадзян. Сабраньня Валэйша і гр. Паўла Жаўрыд.

→ **Беларуская вечарына.** 29 красавіка г. г. адбыўся у нашым горадзе спектакль пад кіраўніцтвам „Гуртка вучнёўскае моладзі пры Радашкоўскае Беларускае гімназіі. Гулялі „Пінская Шляхта“ Марцінкевіча і „Зьбянтэжаны Саўка“ Л. Родзевіча. А гадзіне 8 вечара тэатр быў перапоўнены народам.

З нецярпеньнем усе чакалі, калі растуліцца заслона. Хутка пачалося прадстаўленьне. Большая часьць артыстаў проста на дзіва добра сыгралі свае ролі. А гадзіце 1 ў начы пасьля прадстаўленьня пачаліся скокі. Гэта бадай што першы спэктакль, які прайшоў з поўным пасьпехам. Ен выявіў тутэйшаму грамадзянству, тыя здольнасьці да мастацства, якія крыюцца сярод беларусаў.

Спадзяёмся што ў хуткім часе тутэйшае грамадзянства зноў ўбачыць нешта запраўды мастацкае, вартае увагі, як гэта было і на гэтай вечарыне.

Вучань.

З Менску.

Сельская гаспадарка.

Майстэрні Наркамзему выпускаюць што месяц 100 новых плугоў і 25 веялак. Тутэйшыя плугі шмат лепшыя заграпічных.

Цэнтраземсклад закончыў куплю насеньня і іншых матар'ялаў. У апошняй партыі куплена 4000 пудоў сіняга лубіну, 15000 пудоў штучнага гною і 60 сэпаратараў.

Беларуска-Літоўскі статут у Бел. Дзярж. Бібліатэцы.

Бел. Дзярж. Унів. Бібліатэка абагацілася важнейшым і рэдкіт помнікам беларускага друку—«Літоўскім Статутам» выданьня 1588 г.

Гэту каштоўную кнігу Бібліатэка здабыла ад беларускага энтаграфа А. П. Сапунова.

Апрача гэтага, здабыты ўсе творы Сапунова, якія адносяцца галоўным чынам да матар'ялаў па Вітабшчыне і Полацку.

Бібліяграфія.

Тарас Гушча (Якуб Колас). У Палескай глушы. Віленскае выдавецтва Б. А. Клецкіна. Вільня 1923 г. (185 стар.).

„У палескай глушы“ апавяданьне з жыцьця беларускай вясковай інтэлігэнцыі да часаў першай рэвалюцыі 1905 г. Аўтар ярка малюе жыцьцё гэтай „узгадаванай на катэхізісу Філарэта і нашпігованая начынкаю ў духу „веры, царя и отечества“, якая будучы адарванай ад крыніц народнага жыцьця або заставалася вернай казённым прынцыпам, часткаю апускалася на дно і зацягівалася балотам. Але усё-ж ткі была і болей дзейная часціна інтэлегэнцыя, якая хоць вобмацкам шукала дарог, каб пазнаць корэнь рэчаў. Прадстаўніком такой інтэлегенцыі і зьяўляецца галоўны герой апавяданьня малады вучыцель Лабановіч. Аўтар відаць добра знае быт вясковай інтэлегэнцыі і ўсей душой адчувае і разумея жыцьцё беларускай вёскі. Перад вачыма захопленага чытача ярка выступаюць умела намалёваныя тыпы, жывыя характэрныя сцэны, як з жыцьця вясковай інтэлігэнцыі, так і паляшукоў. Прыгожыя вобразы нашага Палесься, гэтага „Зачараванага краю“ у мастацкім апісаньні Тар. Гушчы яшчэ болей ажыўляюць і без таго цікавы зьмест кнігі.

Кніга выдадзена прыгожа і акуратна, як і ўсе кнігі выдавецтва Б. Клецкіна. „У Палескай глушы“ як зьместам так і вонкавым выглядам будзець багатым укладам у беларускую літэратуру і прыемный аздобай для кожнай бібліатэкі.

Г. К.

Ахвяры на „Новае Жыцьце“.

Ад Міронічыка з Чыкаго —	43	доляр.
„ N-скага — — —	100.000	п. м.
„ Давідовіча — — —	25.000	п. м.
„ Таразэвіча Ан. — — —	200.000	п. м.
„ Зялёнкі Б. — — —	5.000	п. м.

Свая пошта.

Гр. С—ку. Такіх выпадкаў у Заходняй Белхрусі бывае шмат, толькі нажаль мы ня можам іх апавяшчаць і ня маем магчымасьці вам памагчы. Арганізуйцеся і спадзейцеся на свае сілы.

Сэкрэтарыяты Беларускага Пасольскага Клюбу.

1) **Вільня**, Віленская вул. 12 кв. 6.
2) **Ліда**, II Слабодка 8, сэкрэтар Калясінскі.
3) **м. Глыбокае**, Дзісьненскага павету, вул. Сенкевіча 46.
4) **Жодзішкі**, Сьвянцянскага пав. кс. Годлеўскі.
5) **Навагрaдак**, Вялікі Рынак 14, сэкр. Ян. Біруковіч.
6) **Нясьвіж**, Альбянская 28, сскр. Ян Шнаркевіч.
7) **Столбцы**. Шпітальная 22, Г. Сабалеўскі.
8) **Баранавічы**
9) **Горадня**, Мастовая 9.
10) **Валкавыск**, Пясковая 14.
11) **Бельск**, Замковая вул. 3, кв. 1 сэкр. Канстанты Карыцкі.
12) **м. Саколка**, Горадзенская вул. 34.
13) **м. Клешчэлі**, Бельск. павету.
14) **м. Крынкі**, Горадзенскага павету, Горадзенская вул. 34.
15) **Пружаны**. Вул. Дамброўскага 29.

Рэдактар-выдавец Я ЛАГІНОВІЧ.

Друкарня Дворжэца, Завальная 32